***І. У. Забалотная***
*(Мінск, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт)*

# ФЕНОМЕН ВАЙНЫ Ў КАНТЭКСЦЕ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ

Адно са значэнняў слова «феномен» – філасофскае паняцце, якім абазначаецца з'ява, дадзеная нам у вопыце, пачуццёвым пазнанні [1, с. 482]. Такі самы аспект у трактоўцы паняцця «феномен» выдзяляе і М. Мамардашвілі, падкрэсліваючы, што гэта «сутнасць, поўнасцю прадстаўленая сваёй матэрыяй»

[цыт. па: 2, с. 480]. Таму феномен Першай і Другой сусветных войнаў на тэрыторыі Беларусі разглядаецца намі ў святле сапраўдных рэалій тых часоў, г. зн. найбольш істотных з'яў і падзей, якімі яны вызначаліся, і ў кантэксце ўплыву, які яны мелі на беларускую нацыянальную культуру.

Вайна – з'ява не толькі цывілізацыі, але і культуры, бо ў ёй удзельнічаюць людзі, а не толькі тэхніка. Таму ў час вайны, гэтак жа, як і ў мірны час, запатрабаванымі з'яўляюцца духоўнасць, мараль, каштоўнасці і ўсе іншыя магчымыя ўвасабленні культуры, у тым ліку і мастацкай. У сучаснай сацыякультурнай сітуацыі, калі ёсць пагроза сутыкнення цывілізацый не столькі па ідэалагічных, эканамічных, палітычных супярэчнасцях, колькі па прычыне культурных адрозненняў народаў, асобных краін або цэлых блокаў дзяржаў, асабліва актуальнай становіцца праблема нацыянальнай адметнасці феномена вайны.

Першая сусветная вайна ў гісторыі чалавецтва стала адным з самых шырокамаштабных узброеных канфліктаў. Тут упершыню немцамі выкарыстоўвалася зброя масавага паражэння – газ (хлор), а англічанамі – новая ваенная тэхніка (танкі). Разгледзім больш падрабязна рэаліі Першай і Другой сусветных войнаў на тэрыторыі Беларусі.

На працягу двух гадоў і пяці месяцаў (да лютага 1918 года) фронт падзяляў Беларусь на дзве часткі, пад нямецкай акупацыяй апынулася каля паловы тэрыторыі Беларусі. Беларускія губерні знаходзіліся на ваенным становішчы, уводзіўся жорсткі ваенна-паліцэйскі рэжым.

Для ўмацавання свайго ідэалагічнага ўплыву акупацыйныя ўлады аднолькава ставіліся да ўсіх падначаленых нацый. Паўсюль забаранялася навучанне па-руску і ўводзілася абавязковае навучанне на родных мовах ў пачатковай школе для ўсіх карэнных нацый Обер-Оста, куды ўваходзілі Літва, Курляндыя, Беластоцка-Гарадзенская акруга. Вывучэнне нямецкай мовы стала таксама абавязковым, хаця ўсё ж дазвалялася і нацыянальная культурная дзейнасць, у тым ліку выдавецтва газет на роднай мове.

Падчас баявых дзеянняў на Беларусі гінула мірнае насельніцтва, разбураліся гарады і вёскі, знішчаліся матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці. Адступленне расійскіх войскаў у 1915 г. суправаджалася масавым бежанствам (пераважна жанчын, дзяцей і старых). Людзі спяшаліся ўратавацца ад ваеннага тэрору ў прыфрантавой паласе. Расійскія вайскоўцы наўмысна распускалі чуткі пра здзекі немцаў з мірнага праваслаўнага насельніцтва ці прымусова высялялі людзей, якія пакутвалі ад частых абстрэлаў і бамбардзіровак. Сярод вайскоўцаў і бежанцаў апынуліся найбольш

адукаваныя і нацыянальна свядомыя людзі. Вайна раскідала іх па ўсім свеце.

Экстрэмальная сітуацыя вайны з невыноснымі пакутамі насельніцтва і масавым бежанствам, тэрытарыяльная разарванасць краіны падштурхнулі беларускую інтэлігенцыю шукаць шляхі да стварэння сваёй уласнай дзяржавы. Існавалі розныя варыянты атрымання незалежнасці: ад утварэння Канфедэрацыі Вялікага Княства Літоўскага або аўтаноміі ў складзе Расіі да стварэння ўласнай незалежнай рэспублікі. Асабліва вялікую ролю ў імкненні да самастойнай дзяржавы адыгралі бежанцы, якія, з'яўляючыся на сваёй тэрыторыі пражывання маргінальнай часткай беларускага насельніцтва, абвострана ставіліся да праблемы нацыянальнай дзяржаўнасці, а таксама воіны-беларусы, якія, змагаючыся за межамі сваёй тэрыторыі за чужыя інтарэсы, паспелі ўсвядоміць неабходнасць стварэння ўласнай дзяржавы. У выніку правядзення шматлікіх дыскусій розных аб'яднанняў і партый на некалькіх з'ездах было выпрацавана рашэнне аб утварэнні самастойнай беларускай дзяржавы. 9 сакавіка 1918 года была створана Беларуская Народная Рэспубліка. Паколькі ўсё гэта адбывалася ва ўмовах нямецкай акупацыі, Рада БНР звярнулася да Германіі і іншых краін з прапановай аб прызнанні яе дзяржаўнасці. Нягледзячы на тое, што нямецкія ўлады лаяльна паставіліся да незалежнасці БНР, яны ўсё ж не прызналі яе афіцыйна, як не хацела яе прызнаваць і Савецкая Расія. Пацвярджэннем таму з'явіліся шматлікія канферэнцыі, мітынгі 25 сакавіка 1918 г. па ўсёй тэрыторыі краіны, на якіх асуджаўся разрыў з Расіяй, згодніцтва Рады БНР з акупантамі. У прынятай на II з'ездзе Саветаў Заходняй вобласці дэкларацыі Рада вызначалася як контррэвалюцыйная, а яе кіраўнікі аб'яўляліся ворагамі савецкай сацыялістычнай улады. Незалежная Беларуская Народная Рэспубліка праіснавала ўсяго каля дзевяці месяцаў. Але тым не менш, гэты факт меў вялікае гістарычнае значэнне, бо ён выявіў неадольнае жаданне беларускага народа да незалежнасці і самастойнасці.

На працэс культурнай ідэнтыфікацыі беларусаў заўсёды ўплывалі прыгнёт і ціск з боку найбліжэйшых суседзяў, што пастаянна замаруджвала яе развіццё і выспяванне. Нельга не пагадзіцца з меркаваннем В. Акудовіча, які піша: «Яшчэ да апошняга падзелу Рэчы Паспалітай, вынішчаная войнамі з Масковіяй, Беларусь была ўжо ў нейкай ступені "акупаваная" Польшчай. А далей пацягнулася эра перманентнай акупацыі: шведы, французы, немцы, палякі, зноў немцы, а на пачатку, у прамежку і потым – расейцы ... Паднявольны стан, стан акупацыі зрабіўся натуральным для беларусаў, і з цягам часу яны прызвычаіліся да чужын-

нага гнёту, як да ціску атмасферы» [3, с. 63]. Патрэбен быў нейкі адчувальны штуршок, які б прымусіў беларусаў задумацца над сваёй ідэнтычнасцю, вярнуцца да сваіх этнічных каранёў. Такім каталізатарам сталі падзеі Першай сусветнай вайны. Наогул, вучоныя даўно заўважылі сувязь паміж вайной і кансалідацыяй нацыі, працэсам ідэнтыфікацыі яе суб'ектаў (К. Гаджыеў, С. Ханцінгтон, У. Уорнер). Беларускі вучоны Ю. Барысевіч згодны з такім поглядам даследчыкаў, ён лічыць, што для нацыянальнай самасвядомасці мір бывае нават больш небяспечным, чым вайна. Бо вайна, на яго думку, ёсць экзістэнцыяльная сітуацыя, якая прымушае кожнага чалавека ўсвядоміць, разам з кім і супраць каго ён жыве [4, с. 10]. Адным з першых беларускіх дзеячаў, хто заўважыў станоўчае ўздзеянне Першай сусветнай вайны на беларускі нацыянальны рух, на працэс нацыянальнага адраджэння, быў Максім Багдановіч. Ён падкрэсліваў, што менавіта пад уплывам вайны краін Усходняй Еўропы ў іх жыхароў абвастрылася ўсведамленне нацыянальнай самасвядомасці, з'явілася ўяўленне аб самастойным беларускім народзе, а беларуская мова пачала ўжывацца ў перыядычным друку гэтак жа сістэматычна, як руская, літоўская і іншыя [5, с. 284–285]. Максім Гарэцкі, які сам быў непасрэдным удзельнікам Першай сусветнай вайны, адлюстраваў у сваёй аповесці «На імперыялістычнай вайне» настроі беларусаў і іх адносіны да вайны на прыкладзе галоўнага героя твора Лявона Задумы. Працэс беларусізацыі ахапіў найперш яго землякоў, якія змагаліся з ворагам; у іх свядомасці адбывалася яскравая дыферэнцыяцыя: «мы – яны». Крыху пазней у аповесці «Ціхая плынь» М. Гарэцкі на прыкладзе галоўнага героя, беларускага юнака Хомкі Шпака, гэтак жа па-мастацку пераканаўча паказаў, што беларусы ваявалі, адстойваючы не свае, а чужыя інтарэсы. Вайна паскорыла абуджэнне нацыянальнай самасвядомасці ў большасці беларусаў, абвастрыла іх пачуццё адказнасці за лёс нацыянальнай супольнасці. Яна прымусіла еўрапейскія краіны паглядзець на беларусаў як на самастойны і самабытны народ. Аб гэтым сведчыць, напрыклад, артыкул «Аб нас», змешчаны на старонках газеты «Беларускі шлях», дзе прыводзяцца звесткі пра так званае «адкрыццё» беларускага народа: нямецкі генерал Гіндэнбург гаварыў у Берліне, што на берагах Нёмана ён знайшоў новы народ. Нават яўрэі, якія жылі разам з беларусамі на працягу стагоддзяў, пісалі ў сваіх газетах, што з'яўляецца новы народ [6]. Відавочнае ўздзеянне вайны на выспяванне нацыянальнай самасвядомасці падкрэсліваецца і ў артыкуле «Сучасная вайна і адраджэнне пад'ярэмных народаў у Расіі» («Беларускі шлях», 1918 г.). Сутнасць артыкула выяўляецца ўжо

ў самой назве. Аўтар перакананы ў тым, што вайна непарыўна звязана з працэсамі адраджэння нацыянальнай самасвядомасці. Ён сцвярджае: «Сучасная вайна знаменуе сабою іменна адраджэнне пад'ярэмных малых народнасцей. Воляй лёсу выйшла так, што гэтая вайна шмат ім памагла ў напрамку самаіснасці. <...> І вось адраджэнне народнасцей Расіі – самыя лепшыя трафеі сучаснай вялікай вайны» [7].

Як бачым, ужо падчас Першай сусветнай вайны з'яўлялася разуменне таго, што менавіта яна паскарае працэс нацыянальнай ідэнтыфікацыі беларусаў, штурхае шмат каго з жыхароў да разумення неабходнасці ствараць уласную незалежную дзяржаву.

Другая сусветная вайна выдалася самай трагічнай ў гісторыі нашай краіны. Быццам шалёны віхор пранёсся па краіне: разбураныя гарады, спаленыя вёскі, пустыя хаты, зарослыя або незасеяныя палеткі. Асэнсаванне трагедыі вайны беларусамі пачалося адразу ж пасля яе заканчэння. Але ўсведамленне яе жахлівых вынікаў і трагічнай сутнасці ў беларускую гісторыю, літаратуру, мастацтва прыходзіла паступова. Так, доўгі час пасля вайны нічога не гаварылі пра калабарацыянізм, пра сталінскія рэпрэсіі ў дачыненні да ваенных кадраў напярэдадні і пасля вайны. Пасля яе заканчэння ў навуковай літаратуры падаваліся статыстычныя выкладкі пра страты ўсяго *савецкага народа*, а страты, што панеслі асобныя народы, якія ўваходзілі ў склад Савецкага Саюза, як правіла, не ўлічваліся. Наша краіна – адна з былых саюзных рэспублік – мела ў вайне найбольшыя ахвяры: загінуў амаль кожны трэці яе жыхар. У вайне Беларусь згубіла каля 2,7 млн. чалавек [8], так што даваенны ўзровень колькасці жыхароў нашай краіны не адноўлены і да сённяшняга дня.

Да пачатку верасня 1941 года ўся тэрыторыя Беларусі была акупавана нямецка-фашысцкімі захопнікамі, у адрозненне ад большасці іншых былых рэспублік Савецкага Саюза. Ідэалагічнай асновай акупацыйнай палітыкі сталі тэорыі аб расавай перавазе нямецкай нацыі над усімі астатнімі, аб яе праве на сусветнае панаванне і аб пашырэнні прасторы для яе існавання.

Калі ў час Першай сусветнай вайны актуальнай была праблема ідэнтыфікацыі беларускага народа, што знайшло сваё яскравае адлюстраванне ў творчасці М. Гарэцкага, то, змагаючыся з фашысцкімі акупантамі, беларусы адчувалі сябе толькі часткай вялікага савецкага народа. Напярэдадні Другой сусветнай вайны, у 1937–1939 гг., былі знішчаны і адпраўлены ў высылку на Поўнач і Далёкі Усход Расіі дзесяткі тысяч найбольш адукаваных і свядомых беларусаў (паэты, пісьменнікі, публіцысты, філолагі,

гісторыкі і інш.). Была рэпрэсавана большая частка беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі, а таксама найбольш таленавітыя прадстаўнікі беларускай партыйна-савецкай наменклатуры. Масавыя рэпрэсіі і непамерныя ахвяры ў Другой сусветнай вайне сталі прычынай недастатковай падрыхтаванасці жыхароў Беларусі да ўспрымання ідэй прававой і нацыянальнай дзяржавы. У адрозненне ад часоў Першай сусветнай вайны, у 1941–1945 гг. у людзей не было такога моцнага імкнення да стварэння незалежнай беларускай дзяржавы, бо большасць насельніцтва ўспрымала савецкую ўладу як частку асабістай гісторыі. Савецкія беларусы на прасторы былой вялікай агульнай краіны сталі найбольш савецкімі людзьмі. Гэта выяўлялася і на ўзроўні тагачаснай беларускай улады, якая ў большасці сваёй была настроена антынацыянальна, а нават нязначныя праявы беларускасці ўспрымаліся ў агульнай радзіме як шкодны перажытак мінулага. З пункту гледжання беларускага культуролага Ю.Чарняўскай, тып этнічнасці, які склаўся ў час Другой сусветнай вайны, можна ахарактарызаваць, як «кампраміс паміж беларускай і савецкай» [9]. З аднаго боку, на яе думку, агульны вораг, які з’явіўся ў большай частцы народаў Савецкага Саюза, аб’яднаў іх; на другі план адышлі памяць пра раскулачванне, страх перад рэпрэсіямі, бо насельніцтва і ўлада мелі адзіную мэту – перамагчы ворага. З другога боку, як слушна лічыць даследчыца, гэта быў таксама і перыяд надзвычай абвостранага пачуцця савецкімі беларусамі сваёй роднай зямлі [9, с. 274]. Акрамя такога меркавання, варта ўлічваць суаднесенасць паміж этнічнай прыналежнасцю і веравызнаннем. Нездарма беларускі гісторык і ўдзельнік вайны Я. Малецкі ў сваіх успамінах піша, што ў час вайны слова «беларус» абазначала тое самае, што і «рускі», гэта значыць чалавек праваслаўнага веравызнання. Беларусы-католікі лічылі сябе палякамі. Некаторыя з іх, адказваючы на пытанне пра нацыянальнасць, таксама называлі сябе палякамі, аднак, удакладнялі, што дома размаўляюць «папросту» (г. зн. па-беларуску) [10, с. 71]. З гэтага відаць, што беларуская мова не карысталася вялікай папулярнасцю, што часткова было абумоўлена розным веравызнаннем беларусаў. Крызіс у станаўленні нацыянальнай самасвядомасці падчас Другой сусветнай вайны відавочны. Адсутнасць беларускай эліты, якая б натхняла народ на шляху да нацыянальнай ідэнтыфікацыі, зніжэнне дзяржаўнай ролі беларускай мовы, адсутнасць пачуцця абвостранай неабходнасці ў нацыянальнай самасвядомасці на масавым ўзроўні, змаганне за агульныя савецкія ідэі – усё гэта непазбежна вяло да крызісных з’яў у станаўленні самасвядомасці беларусаў.

Аднак пра агульны крызіс нацыянальнай ідэнтыфікацыі нельга гаварыць катэгарычна, бо рабіліся спробы яе адраджэння з боку так званых калабарантаў. Гісторыкі адносяць да калабарантаў тры катэгорыі людзей [11]. Першую групу складаюць людзі, якія былі ў апазіцыі да бальшавізму, рабілі стаўку на Германію, разлічваючы з яе дапамогай адрадзіць незалежную Беларусь. Да другой групы належалі тыя, хто паверыў немцам і свядома пайшоў да іх на службу. І, нарэшце, апошнімі былі тыя, хто воляй лёсу апынуўся ў першай ці другой групе і быў пазбаўлены іншага выбару. Часта людзі турбаваліся пра сваіх родных, якія зніклі або трапілі ў палон, і гэта вымушала іх наладжваць сувязі з нямецкай вайсковай адміністрацыяй. Абвяшчэння незалежнай беларускай дзяржавы з дапамогай нямецкіх улад так і не адбылося, нягледзячы на тое, што з дазволу акупацыйных улад былі створаны Беларуская народная самапомач, Саюз беларускай моладзі, Беларуская краёвая абарона. Але не заўсёды сапраўды станоўчыя ідэі для аднаўлення беларускай нацыянальнай самасвядомасці прымаліся такімі арганізацыямі. Так, напрыклад, Саюз беларускай моладзі, які ставіў за мэту выхаванне ў маладых беларусаў нацыянальнай свядомасці, адначасова распаўсюджваў сярод іх ідэі нацызму і антысемітызму. Пра такія рэальныя з’явы тагачаснай рэчаіснасці сведчаць у сваіх мастацкіх творах шмат якія беларускія пісьменнікі, напрыклад, І. Чыгрынаў («Свае і чужынцы»), К. Акула («Змагарныя дарогі») і інш. Гісторык З. Шыбека справядліва лічыць, што калабарацыянізм быў «жэстам адчаю», «супрацоўніцтвам са сцятымі зубамі» [8, с. 333]. На думку гісторыка культуры Л. Лыча, на акупаванай тэрыторыі Беларусі адбывалася адраджэнне беларускай мовы і школы, беларускай царквы і культуры, асабліва, калі параўнаць гэты час з этапам сталінскага тэрору 1930-х гг. [12]. З такім сцвярджэннем можна пагадзіцца толькі часткова. Сапраўды, нямецкія акупанты толькі ў невялікай ступені і хутчэй выпадкова, чым мэтанакіравана, садзейнічалі беларускаму адраджэнню. У вайну выдаваліся беларускія газеты, часопісы, календары («Баранавіцкая газета», «Менская газета», «Беларуская старонка», «Голас вёскі» і інш.). У перыядычных выданнях выкрываліся сталінскія злачынствы, друкаваліся гістарычныя і этнаграфічныя матэрыялы, змяшчаліся новыя музычныя і літаратурныя творы. Але разам з гэтым знішчаліся нацыянальныя культурныя каштоўнасці, звязаныя з пэўнымі гістарычнымі падзеямі, з савецкай рэчаіснасцю. Найбольш каштоўныя прадметы культуры вывозіліся ў Германію, так што, нягледзячы на дазволеныя акупантамі магчымасці існавання некаторых элементаў нацыянальнай культуры, пашкоджанне ма-

тэрыяльных і духоўных яе артэфактаў, агульныя страты нацыянальнай культуры сталі нашмат большымі, не кажучы ўжо пра жахлівы намер знішчэння беларускага народа. Як вынікае з усяго гэтага, фашысцкія акупанты ажыццяўлялі ўласныя мэты: сапсаваць адносіны беларусаў з рускім і польскім народамі, выклікаць у насельніцтва крытычнае стаўленне да ўсяго таго, што рабілася да вайны, разбурыць матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці народа.

Такім чынам, акупацыйны перыяд стаў для беларусаў своеасаблівым вопытам выжывання ва ўмовах фашысцкай навалы, калі рэальнай стала пагроза страты не толькі сваёй нацыянальнай ідэнтычнасці, але, нават, і фізічнага існавання. У сакрэтным дакуменце «Заўвагі і прапановы “Усходняга міністэрства” па генеральнаму плану “Ост”» фашысты напачатку вайны збіраліся выселіць 75 % беларусаў, а 25 % – анямечыць. Усё гэта, на думку Э. Ветцэля, удалося б зрабіць вельмі лёгка, таму што ў беларусаў адсутнічала нацыянальнае пачуццё [13, с. 42]. У пэўным сэнсе спадар Ветцэль меў рацыю, тым больш, калі ўлічыць, што значная частка беларускай інтэлігенцыі была ўжо да гэтага часу знішчана сталінскімі рэпрэсіямі. Але акупацыйныя ўлады недаацанілі стойкасць, сілу духу, ахвярнасць і гераізм беларускага народа, якія выявіліся ў шырокім партызанскім руху, здзяйсненні подзвігаў на фронце і ў тыле ворага.

Каб скараціць 30-гадовы тэрмін выканання плана «Ост», немцы імкнуліся знішчыць як мага больш беларусаў яшчэ на працягу вайны. Пад пагрозай суцэльнага вынішчэння апынулася мірнае насельніцтва Беларусі. Фашысты праводзілі карныя экспедыцыі, падчас якіх спальваліся цэлыя вёскі разам з іх жыхарамі толькі за тое, што яны знаходзіліся ў раёне дзеяння партызан. Дакументальная кніга А. Адамовіча, Янкі Брыля, У. Калесніка «Я з вогненнай вёскі...» змяшчае ўспаміны людзей, якія цудам ратаваліся і не загінулі разам з іншымі жыхарамі. Аўтары ездзілі па ўсёй Беларусі і запісвалі сапраўдныя гісторыі людзей з «вогненных вёсак». Вайна зачапіла кожнага беларуса, кожную сям’ю, што прывяло да трагедыі ўсяго народа. У беларускай мастацкай літаратуры пра гэта створаны цэлы шэраг апавяданняў, аповесцей, п’ес і нават цыклаў раманаў. Гісторык З. Шыбека справядліва сцвярджае, што вайна набывала элементы грамадзянскай [8, с. 326]. Мірныя жыхары апынуліся адразу паміж некалькіх небяспек, якія ішлі ад фашыстаў, паліцаяў, партызан. У некаторых выпадках партызаны забівалі настаўнікаў як здраднікаў, бо яны працавалі ў беларускіх школах, адчыненых немцамі. Арганізоўваліся засады то з аднаго, то з другога боку, а

заложнікамі станавіліся цэлыя сем'і і нават вёскі, так што мірнае насельніцтва неверагодна пакутвала.

Тым не менш, партызанскі рух набываў усё больш масавы і арганізаваны характар, нягледзячы на тое, што яго рост выклікаў хвалю карных экспедыцый. У партызанскіх атрадах Беларусі ваявалі не толькі самі беларусы, але і прадстаўнікі амаль усіх нацыянальнасцей Савецкага Саюза. У некаторых партызанскіх зонах працавалі школы, медыцынскія пункты, якія абслугоўвалі партызан і насельніцтва. У барацьбе партызан з нямецкімі акупантамі вялікую ролю адыграла дапамога большасці насельніцтва Беларусі, якое забяспечвала партызан харчаваннем, адзеннем, абуткам; часам жыхары выконвалі абавязкі сувязных і разведчыкаў. Акрамя таго, на Беларусі разгарнуўся шырокі падпольны рух. Асноўнымі яго задачамі было вядзенне разведкі, ажыццяўленне дыверсій на прамысловых прадпрыемствах і транспарце, знішчэнне ворагаў.

Згодна з генеральным планам «Ост», яўрэі, якія з часоў Вялікага Княства Літоўскага пражывалі побач з беларусамі, падлягалі татальнаму вынішчэнню. Вось як пісаў пра гэта яшчэ ў 1935 г. будучы генеральны камісар генеральнай акругі Беларусь В. Кубэ (газета «Beobachter»): «Тое, што для здароўя чалавецтва значаць бляшкі, туберкулёз або сіфіліс, тое ж значыць яўрэйства для жыццяздольнасці белых расаў... Бацыланосьбіт гэтай хваробы павінны быць ізаляваны і знішчаны» [14, с. 55]. На тэрыторыі Беларусі былі створаны лагеры смерці і гета, ў якія зганялі тысячы яўрэяў, жыхароў нашай краіны і іншых дзяржаў. Самае вялікае гета знаходзілася ў Мінску, гета існавалі амаль ў кожным значным паселішчы, у якім да вайны яўрэі складалі вялікую частку насельніцтва (ў Гродна, Брэсце, Віцебску, Слоніме, Бабруйску, Барысаве і ў іншых гарадах і пасёлках). Нягледзячы на тое, што лёс яўрэяў быў прадвызначаны, яны не здаваліся. Яўрэяў часта хавалі і ратавалі беларусы, у якіх хапала мужнасці рызыкаваць уласным жыццём. Пасля вайны і распаду Савецкага Саюза многія беларусы былі ўдастоены ганаровага звання «Праведнік народаў свету». Згодна з дадзенымі Інстытута Яд ва-Шэм, на 1 студзеня 2011 года ў Беларусі налічвалася 555 праведнікаў народаў свету [15]. Шмат якім вязням удавалася ўцячы з гета. Неверагодны спосаб для ўцёкаў прыдумалі вязні Навагрудскага гета: яны пракапалі тунэль. І днём і ноччу працавалі ва ўмовах пастаяннага страху (лагер добра ахоўваўся, а немцы праводзілі праверкі ў любы час). Дзякуючы неймавернай мужнасці, неадольнаму жаданню выратавацца вязні змаглі пераадолець шматлікія перашкоды на сваім шляху (у тунэлі яны самі здолелі правесці электрычнасць, зрабіць вентыляцыйныя адтуліны і падпоры для таго, каб не абвальвалася зямля),

і пад пагрозай штохвіліннага расстрэлу прайсці адзін за адным да выхаду, каб схавацца ў лесе і далучыцца да партызан.

З'явіліся яўрэйскі партызанскі атрад Шолама Зорына і сямейныя атрады братоў Бельскіх, якія дзейнічалі непадалёк ад Мінска і ў лясах Навагрудскага раёна. Атрады братоў Бельскіх налічвалі да канца вайны больш за тысячу чалавек, якія не толькі змагаліся з ворагам, але і проста выжывалі, працавалі ў майстэрнях, вырабляючы рэчы, патрэбныя для ўсіх партызан. Сямейныя яўрэйскія лагеры, якія існавалі ў Беларусі, былі унікальнай з'явай для ўсёй Заходняй Еўропы, бо ў гісторыі Катастрофы іншых еўрапейскіх краін, акупаваных немцамі, такіх прыкладаў не існуе.

Такім чынам, беларускі нацыянальны кантэкст феномена Першай і Другой сусветных войнаў вылучаецца наступнымі асаблівасцямі.

Першая. Заканамерным следствам Першай сусветнай вайны стала выспяванне нацыянальнай самасвядомасці і актуалізацыя роднай мовы. Менавіта ў гэтай вайне, калі беларусы змагаліся не за свае ўласныя нацыянальныя ідэі або прыярытэты, а за чужыя, якіх яны не разумелі, разгарнулася актыўная дзейнасць грамадскіх аб'яднанняў і партый па нацыянальным адраджэнні, што прывяло да стварэння Беларускай Народнай Рэспублікі. Значная роля ў стварэнні сваёй нацыянальнай дзяржавы належала не толькі партыям, але і непасрэдным удзельнікам вайны.

Другая сусветная вайна, у адрозненне ад Першай, не мела такой вырашальнай ролі ў плане станаўлення нацыянальнай самасвядомасці. Але разам з тым, у некаторай часткі беларускага народа ў пасляваенныя гады з'явілася імкненне да вызвалення свядомасці ад навязаных прапагандысцкіх міфаў (пра тое, напрыклад, што Сталін мудры і геніяльны правадыр, а беларусы – гэта, найперш, савецкі народ і інш.).

Другая. Раптоўны пачатак Другой сусветнай вайны найбольш жахліва адбіўся менавіта на тэрыторыі Беларусі, на якую прыйшлася найбольшая колькасць людскіх ахвяр і найвялікшыя страты матэрыяльных каштоўнасцей. Уся тэрыторыя Беларусі была акупавана ў адрозненне ад большасці рэспублік былога Савецкага Саюза, але народ не страціў сілы духу, якая выявілася ў гераічным змаганні супраць фашысцкіх захопнікаў на фронце і ў шырокім партызанскім руху, які набыў яшчэ большы размах у сярэдзіне і на апошнім этапе Другой сусветнай вайны.

Трэцяя. Беларусь з'яўляецца унікальным прыкладам існавання масавых і разнастайных форм супраціву ва ўмовах акупацыі сярод іншых краін Еўропы (партызанскі рух, дзейнасць падпольшчыкаў, яўрэйскі супраціў, дапамога мірнага насельніцтва ў выратаванні

яўрэяў і інш.). Сямейныя яўрэйскія лагеры, якія існавалі ў Беларусі, былі унікальнай з'явай для ўсёй Заходняй Еўропы.

Чацвёртая. У час абедзвюх сусветных войнаў у беларусаў найбольш выразна выявіліся такія адвечныя маральныя каштоўнасці, як мужнасць, трываласць, самаахвярнасць, чалавечая годнасць, гераізм, пра што сведчыць вялікая колькасць найвышэйшых ваенных узнагарод і ганаровых званняў, якія атрымалі ўдзельнікі баёў на фронце і ў партызанах, а таксама масавы ўдзел жыхароў Беларусі ў выратаванні людзей іншых нацыянальнасцей і самаахвярная праца па аднаўленні ўсёй гаспадаркі краіны, разбуранай вайной.

Пятая. Наяўнасць такіх маральных каштоўнасцей, якія выявіліся ў беларускага народа ў экстрэмальных абставінах вайны, дазваляе разглядаць сам феномен вайны і яго рэаліі не толькі ў кантэксце нацыянальнай культуры, але і ва універсальным кантэксце, г. зн. у святле агульначалавечага вымярэння, з пункту гледжання магчымасці ўзбагачэння іншых нацыянальных культур у працэсе міжкультурнай камунікацыі, якая адбываецца ў наш час, у эпоху глабалізму.

## Літаратура


1. Феномен // Философский словарь / под ред. И. Т. Фролова. М., 1991. С. 482.
2. *Зинченко, В. П.* Сознание и творческий акт / В. П. Зинченко. М., 2010.
3. *Акудовіч, В.* Код адсутнасці / В. Акудовіч. Мінск, 2007.
4. *Барысевіч, Ю.* Паміж гісторыяй і геаграфіяй / Ю. Барысевіч // Культура. 1993. № 24. С. 10.
5. *Багдановіч, М.* Поўны збор твораў. У 3 т. Т. 2. Маст. проза, пераклады, літаратурныя артыкулы, рэцэнзіі і нататкі, чарнавыя накіды / М. Багдановіч. Мінск, 1993.
6. *Я-р.* Аб нас / Я-р // Беларускі шлях. 1918. 11 мая.
7. Сучасная вайна і адраджэнне пад'ярэмных народаў у Расіі // Беларускі шлях. 1918. 10 ліпеня.
8. *Шыбека, З.* Нарыс гісторыі Беларусі (1795–2002) / З. Шыбека. Мінск, 2003.
9. *Чернявская, Ю. В.* Белорусы. От «тутэйшых» – к нации / Ю. В. Чернявская. Минск, 2010.
10. *Малецкі, Я.* Пад знакам пагоні / Я. Малецкі. Таронта, 1976.
11. Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. Ч. 2 / М. П. Касцюк, І. М. Ігнаценка, У. І. Вышынскі і інш.; Інстытут гісторыі АНБ. Мінск, 1995.
12. *Лыч, Л.* Нацыянальна-культурнае жыццё на Беларусі ў часы вайны (1941–1944 гг.) / Л. Лыч. Вільня, 2011.
13. *Бягун, У.* Чаго не бачыць турыст / У. Бягун. Мінск, 1971.
14. *Смоляр, Г.* Менскае гета: Барацьба савецкіх габрэяў-партызанаў супраць нацыстаў / Г. Смоляр. Мінск, 2002.
15. Статистические данные по странам [Электронный ресурс]. – Рэжым доступу: http://www1.yadvashem.org/yv/ru/righteous/statistics.detailed.asp. – Дата доступу: 15.12.2011.